# ПАВАГА ДА МАЦІ

## Як спраўдзіць мару Драздовіча?

**Аляксандр КАНАВАЛАЎ ужо гадоў дзесяць падарожнічае па Беларусі на ровары з фотаапаратам. Штогод пенсіянер пераадольвае сотні кіламетраў, заязджае нават у глухія мясціны, да якіх дабярэцца рэдкі турыст. Ён фіксуе куточкі, якімі захапляецца, і сваімі адкрыццямі шчыра дзеліцца з усімі, каго сустракае ў дарозе. Спачатку браў з сабой здымкі, а пасля, як пасябраваў з сучаснымі тэхналогіямі, — спасылкі на рэсурс, дзе выкладзены сотні яго фатаграфій. Усе з адной мэтай: паказаць непаўторную, неспазнаную, дагледжаную Беларусь. І натхніць сваім прыкладам на вандроўкі.**



Аляксандр Канавалаў зрабіў альбом, прысвечаны мастаку і мясцінам, з ім звязаным.

Ён дзеліцца са мной сваімі фатаграфіямі, гісторыямі і ўпэўненасцю, што ў Год гістарычнай памяці лепшы інструмент для выхавання моладзі знайсці будзе цяжка. Дарога дае шмат. Узбагачае ведамі, знаёмствамі, прыводзіць у маленькія «нераскручаныя» музейчыкі, мясцовыя жыхары падказваюць мясціны, вартыя ўвагі, пра якія не пачытаеш ні ў якім інтэрнэце.

А яшчэ мужчына адгукаецца на скаргі мясцовых жыхароў, прыкмячае, якім аб'ектам патрэбная дапамога, і спрабуе выйсці на людзей, што гэтыя хібы могуць выправіць. Так, дзякуючы яго зваротам адноўлены



Да і пасля добраўпарадкавання.

гноман — сонечны гадзіннік XVIII стагоддзя на тэрыторыі Траецкага касцёла ў Ішчэлне Шчучынскага раёна Гродненскай вобласці і добраўпарадкавана магіла маці Язэпа Драздовіча.

### Па мясцінах мастака

Спачатку мой суразмоўнік для сваіх вандровак выбіраў адметныя мясціны: самы высокі пункт, самае вялікае возера, самая кароткая рака... Здымкі наклейваў на вялікія аркушы і рыхтаваў выставы для студэнтаў. Аляксандр Канавалаў 16 гадоў выкладаў у Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце, і нават калі сышоў на пенсію, стараецца быць карысным для моладзі.

Пасля падарожнік стаў аб'язджаць мясціны, звязаныя з гістарычнымі падзеямі ці вядомымі асобамі.

Рыхтуючыся да вандровак, ён збіраў інфармацыю пра знакамітых беларусаў, каб скласці пэўныя маршруты. «Мой тата быў мастаком. Таму мне вельмі хацелася здзейсніць падарожжа па мясцінах Язэпа Драздовіча, тым больш мяне моцна зачапіла гісторыя гэтага чалавека, яго пакутны лёс», — падзяліўся Аляксандр Канавалаў. Ён наведаў мясціны, звязаныя з захаваннем памяці пра мастака, шукаў вуліцы і будынкі, якія носяць яго імя. Праехаў маршрутамі, па якіх некалі хадзіў Язэп Нарцызавіч.

Сабраны ў час падарожжаў матэрыял Аляксандр Міхайлавіч упарадкаваў і стварыў асобны альбом з фатаграфіямі з уласных падарожжаў і біяграфічнымі звесткамі з жыцця Драздовіча, які бярэ з сабой, калі выпраўляецца на сустрэчы са студэнтамі.

Адна з вандровак Аляксандра Міхайлавіча стала для яго і адкрыццём, і пошукам. Ён наведаў аграгарадок Германавічы Шаркаўшчынскага раёна Віцебскай вобласці. Тут знаходзіцца музей народнай культуры і быту, добрая частка якога прысвечана знакамітаму земляку Язэпу Драздовічу. А на Цярэшкаўскіх могілках аграгарадка пахавана маці мастака Юзэфа Янаўна. Калі Аляксандр Канавалаў убачыў упершыню пліту — зарослую чорным імхом, ды так, што на ёй не відаць літар, яшчэ і з вялікім пнём ад спіленага дрэва, што расло на месцы пахавання, — жахнуўся. Пачаў звяртацца ва ўсе інстанцыі з просьбай аб упарадкаванні магілы. На яго ідэю адгукнуўся Беларускі саюз жанчын. Сёння помнік дагледжаны, агароджаны, стаіць інфармацыйны стэнд.

Гэты пункт можна нават уключаць у рэспубліканскія турыстычныя маршруты па мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю майстра. У свой час мастак нямала пахадзіў па свеце, нават пісаў пра сябе, што «з вечна вандроўных, бяздомных людзей, якія ўласнага кута не маюць». А каб зрабіць маршрут больш насычаным, на думку Аляксандра Канавалава, у аграгарадку Германавічы трэба змясціць інфармацыю з указаннем мясцін, дзе жыў, вучыўся і стварыў шэдэўры беларускі Да Вінчы (так часам называлі Драздовіча). Сярод такіх куточкаў — вёскі Красоўшчына, Сталіца, Лужкі, Ляпляне, гарады Дзісна і Глыбокае. Магчыма, варта было б паставіць указальнікі да вёскі Ляпляне і былога хутара Пунькі, дзе некалі нарадзіўся Драздовіч. Пакуль гэта нікому не вядомы глухі куток, што і не дзіва: сёння там і слядоў не засталося ад былога жытла — проста паляна, якая штолета зарастае высачэзнай травой.

### Прыклад для наступных пакаленняў

А можа, магіла маці Драздовіча дазволіць распрацаваць новую тэму для даследаванняў і турыстычных маршрутаў, звязаных з маці знакамітых людзей, якія, бясспрэчна, аказвалі ўплыў на сваіх дзяцей?..

У Юзэфы быў няпросты лёс. Яна рана стала ўдавой. Язэпу — самаму малодшаму з шасці яе дзетак — на той час было ўсяго два гады. Жанчыне давялося самой узнімаць сям'ю, шмат пераязджаць з месца на месца ў



Хутар Пунькі, дзе нарадзіўся мастак.

пошуках зямлі, якую можна арандаваць. Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці яна падтрымала мары сына аб вучобе ў Вільні ў мастацкай школе.

Сюжэты многіх работ Драздовіча, бясспрэчна, былі пазычанымі ў маці — Юзэфа ведала на памяць багата легендаў і казак, баек, песень, прыказак і прымавак. Усё гэта яна перадавала дзецям. І нават захапленне астраноміяй таксама ўзнікла спачатку ў сям'і. У свае работы Драздовіч уплятаў захапленне роднай зямлёй і любоў да яе, перанятую ад маці. Ён спрабаваў разгадваць тайны старых гарадзішчаў і далёкіх планет...

Калі жанчыны не стала, для Язэпа гэта было страшэннай трагедыяй. У сваіх дзённіках мастак з болем адзначаў, што ніяк не можа спраўдзіць сваю мару — паставіць помнік на магіле маці, бо сам жыве ў галечы... Урэшце, на магіле з'явіўся сціплы камень з надпісам на лацінцы, зроблены па эскізе самога Язэпа Драздовіча.

Але гісторыя магла б мець працяг. Цудоўна, калі б таленавітыя сучасныя мастакі пайшлі далей і зрабілі барэльеф Юзэфы, тым больш што Язэп Нарцызавіч пакінуў яе выяву — выразаў партрэт з дрэва. Памяць пра пяшчотныя і паважлівыя адносіны ў сям'і Драздовічаў магла б паслужыць прыкладам наступным пакаленням. З гэтай гісторыі можна пачынаць гутаркі з дзеткамі пра агульначалавечыя, сямейныя каштоўнасці, пра павагу да блізкіх, да роднай зямлі і яе традыцый.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# РАТАВАЛЬНІКІ ВАЧЫМА ДЗЯЦЕЙ

## У Мінску ўзнагародзілі пераможцаў рэспубліканскага агляду-конкурсу з такой назвай

**Традыцыйна месцам развіцця ўсіх падзей стаў сталічны Палац дзяцей і моладзі, дзе прайшла выстаўка конкурсных работ. Там было прадстаўлена больш за 300 узораў дзіцячай творчасці, аб'яднаных тэмай бяспекі: казкі, апавяданні, вершы, малюнкі, скульптуры малых форм, мадэлі пажарнай аварыйна-ратавальнай тэхнікі, коміксы і стыкерпакі. Работы здзіўлялі ўсіх наведвальнікаў не толькі разнастайнасцю жанраў, але і ўзростам удзельнікаў, частка з якіх нядаўна пераступіла школьны парог.**



Перад хвалюючым момантам узнагароджання хлопчыкаў і дзяўчынак чакала наведванне адукацыйнага цэнтра бяспекі МНС. Дзеці былі ў захапленні ад забаўляльнай праграмы: уразіла колькасць лакацый і дэталёвыя прапрацоўкі небяспечных сітуацый, у якіх можа апынуцца не толькі дзіця, але і дарослы. Пераход дарогі на забаранняльны сігнал святлафора, сустрэча з незнаёмцам у ліфце або цёмным завулку, ДТЗ, пажар, ураганны вецер і іншыя надзвычайныя здарэнні былі змадэляваны з выкарыстаннем натуральных аб'ектаў, рэчаў, прадметаў або ў віртуальнай рэальнасці. Ніхто не згубіў магчымасці выпрабаваць сябе ў праходжанні асобных квэстаў — выбрацца з задымленага памяшкання, аказаць першую дапамогу пацярпеламу або прышпіліць рамень бяспекі ў перакуленай машыне.

Пасля такога ўсплёску эмоцый і адрэналіну ўдзельнікі конкурсу адправіліся ў Палац дзяцей і моладзі — па заслужаныя ўзнагароды. Віталь іх **намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Андрэй ЮРЖЫЦ**.

— Конкурс «Ратавальнікі вачыма дзяцей» — вельмі важнае мерапрыемства не толькі для МНС, але і для краіны ў цэлым. Нават такім шляхам — праз дзіцячую творчасць — мы клапоцімся пра бяспеку грамадзян. Калі дзеці ведаюць гэтыя правілы — іх ведаюць і бацькі, якія, у сваю чаргу, даносяць гэта да іншых людзей, выкарыстоўваюць у рэальным жыцці.

Усяго было ўзнагароджана больш як 65 дзяцей самых розных узростаў. Уражаннямі ад удзелу ў конкурсе падзялілася Паліна Саланінка, якая прадстаўляла сваю работу ў намінацыі «Комікс»:

— У якасці тэмы для работы я выбрала правілы бяспекі ў парку атракцыёнаў. Вырашыла, што яны вельмі актуальныя напярэдадні адкрыцця сезона. Аддала перавагу коміксу, таму што менавіта ў такім фармаце лягчэй за ўсё расказаць гісторыю на прыкладзе канкрэтных сітуацый. Лічу, што ўдзел у гэтым конкурсе дапамагае не толькі раскрыць творчыя здольнасці, але і навучыць больш сур'ёзна думаць аб бяспецы.

Вадзім Панкоў, прадстаўнік Гомельскай вобласці, які заняў 2-е месца ў намінацыі «Малюнак» ва ўзроставай катэгорыі 7—10 гадоў, у сваёй рабоце паказаў пажарнага, які шчытом закрывае вёску ад агню.

— Менавіта ён стаў маім героем, бо прафесія «ратавальнік» вельмі важная для ўсіх нас. У будучыні я таксама хачу ім стаць, каб абараняць людзей ад бед.

Пасля ўручэння заслужаных узнагарод дзеці з задавальненнем пазіравалі для агульнага фота і сваімі ўсмешкамі дзякавалі арганізатарам за магчымасць праявіць сябе ў творчасці.

**Алена БУГАЕВА,**
**галоўны спецыяліст**
**Рэспубліканскага цэнтра**
**прапаганды МНС.**